Пазнаць таямніцы роднай мовы

Ужо чатыры гады ў нашай школе працуюць класы з вывучэннем беларускай мовы на павышаным узроўні. І мы, вучні 10 класа, выучаем беларускую мову не толькі для таго, каб лепш падрыхтававцца да экзаменаў, але і для таго, каб глыбей пазнаць таямніцы роднай мовы. Беларуская мова прайшла доўгі гістарычны шлях, на якім былі як часы росквіту, так і часы заняпаду. Былі нават такія перыяды, калі яна ледзь не знікла. Нашы бацькі, дзяды і прадзеды нямала зрабілі, каб беларуская мова была прызнаная як роўная сярод іншых моў свету. Зараз у нашым рознакаляровым і рознагалосым свеце налічваецца больш за шэсць тысяч моваў. Палова з іх пад пагрозай знікнення. Няхай сёння родная мова моцная, распаўсюджаная, абароненая заканадаўствам, але няма гарантыі, што ўжо заўтра яна не трапіць у спіс тых трох тысяч, гатовых знікнуць. Мова – жывая існасць, якая жыве там, дзе ёсць людское жаданне. Наша мова прыгожая, мілагучная, вы зразумееце гэта, калі станеце на роднай мове чытаць творы і гаварыць.

***Вучаніцы 10 класа ДУА “Сярэдняй школы №4 г.Магілёва”***
***Зямлінская Паліна і Фралова Валерыя***